*3 американских независимых фильма на выходные*», «*#Кинокомбо. 2 фильма о подростках из конкурса Берлинского фестиваля*». Менавіта ў блогу кінааглядальнік вольная ў сваіх інтэрпрэтацыях: «*Удаются с одной лишь оговоркой: этот экранный мазохизм приносит мексиканцу не освобождение через страдания, а чистейшее удовольствие*» [3, с. 329].

У Г. Яфрэменка выпрацаваўся свой аўтарскі почырк, у нейкім сэнсе нават схема да інтэрпрэтацыі, якая абавязкова ўключае ў сябе зварот да асобы рэжысёра, спецыфікі або эвалюцыі яго светаўспрымання, абставін творчасці, рэчаіснасці, якая падштурхнула рэжысёра да стварэння фільма. Адметнасць аўтарскай інтэрпрэтацыі Г. Яфрэменка – гэта ўцягванне ў працэс свайго чытача, наладжванне дыялогу з ім. Месцамі кінааглядальнік прад'яўляе завышаныя чаканні да фільма і да кінапрацэсу ўвогуле, дзесьці дазваляе сабе выкарыстоўваць негатыўныя канатацыі ў інтэрпрэтацыі. Аднак на гэта знаходзіцца свой чытач, для якога рэцэнзіі Г. Яфрэменка з'яўляюцца пэўным арыенцірам у свеце кіно.

**Біяграфічныя спасылкі**


1. *Саенкова-Мельницкая Л. П.* Визуально-смысловые акценты белорусского киноэкспрессионизма // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : сб. тр. IX Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 25–26 октября, 2018 г. Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы. 2018. С. 130–134.
2. *Точицкая Н.* Блоговая арт-журналистика Беларуси (на примере портала Kinorama) // Мультимедийная журналистика: медиакоммуникации и медиаиндустрия : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 1 марта 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: О. М. Самусевич (отв. ред.) [и др.]; под общ. ред. Н. А. Федотовой. Минск, 2019. С. 156–158.
3. *Ефременко А.* Кинорама. [Б. м.] : Издательские решения, 2018. 350 с.


# ВЫЯЎЛЕННЕ АБАРОНЧЫХ МЕХАНІЗМАЎ ПСІХІКІ ПЕРСАНАЖАЎ У БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ XX СТАГОДДЗЯ


***І. Ч. Часнок***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*hm90@tut.by*



У артыкуле разгледжана выяўленне абарончых механізмаў псіхікі ў мастацкіх творах: выцясненне («Золата» Ядвігіна Ш., «Рускі» М. Га-

рэцкага), праекцыя («Міхаська» Цёткі), замяшчэнне («Міхаська» Цёткі), рацыяналізацыя («Рускі» М. Гарэцкага), саматызацыя («Рускі» М. Гарэцкага), інтраекцыя («Голы звер» М. Зарэцкага), маралізацыя («Кветка пажоўклая» М. Зарэцкага), сыход ад трывожнасці ў дзейнасць («Кветка пажоўклая» М. Зарэцкага), дысацыяцыя («Лявоніус Задумекус» М. Гарэцкага). Выяўленыя прыклады сведчаць пра высокую псіхалагічную культуру пісьма беларускіх класікаў, якая дазволіла ім мадэляваць механізмы падсвядомага герояў.

***Ключавыя словы:*** псіхалагізм; псіхалагічная абарона; выцясненне; рацыяналізацыя; праекцыя; замяшчэнне; інтраекцыя; беларуская проза.

## IDENTIFICATION OF DEFENSIVE MECHANISMS OF THE PRYCHE OF CHARACTERS IN BELARUSIAN PROSE OF THE TWENTIETH CENTURY

***I. Ch. Chasnok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: I. Ch. Chasnok (hm90@tut.by)*

The article deals with the demonstration of the psychological defense activities in the literary works: displacement («Zolata» by Yadvigin Sh., «Rusky» by M. Garetsky), projection («Mikhaska» by Tsetka), substitution («Mikhaska» by Tsetka), rationalization («Russky» by M. Garetsky), somatization («Russky» by M. Garetsky), introjection («Goly zver» by M. Zaretski), moralization («Kvetka pazhouklaya» by M. Zaretski), turning anxiety into action («Kvetka pazhouklaya» by M. Zaretski), dissociation «Lyavonius Zadumekus» by M. Garetsky). The revealed examples show the high psychological culture of Belarusian classics' writing, which allowed them to model the mechanisms of the heroes' subconscious.

***Key words:*** psychology; psychological defense; displacement; rationalization; projection; substitution; introjection; Belarusian prose.

Псіхалагічная характарыстыка персанажаў, інтэрпрэтацыя матываў іх паводзін, адлюстраванне ўнутраных зрухаў у душах літаратурных герояў ужо неаднаразова станавілася ў цэнтры ўвагі даследчыкаў. Вывучэнню мастацкага псіхалагізму надавалі ўвагу ў сваіх працах

А. Адамовіч, А. Лойка, А. Матрунёнак, Я. Казека, Л. Сінькова (Корань) [8; 11] і інш. Псіхалагізм таксама актыўна даследуецца зараз у працах А. Андрэева, Д. Казловай, В. Ткачук [1; 5; 10] і інш. Нас жа будзе цікавіць выяўленне ў літаратуры важнага феномена, які звычайна становіцца аб'ектам даследавання не літаратуразнаўчых работ, а даследаванняў па псіхалогіі – абарончых механізмаў (псіхалагічных абарон).

Пад псіхалагічнымі абаронамі будзем мець на ўвазе абарончыя механізмы псіхікі чалавека, якія валодаюць наступнымі функцыямі: «дзейнічаюць на неўсвядомленым узроўні і таму з'яўляюцца сродкамі самападману» [9, с. 46]; «яны скажаюць, адмаўляюць ці фальсіфікуюць успрыняцце рэальнасці, каб зрабіць трывогу менш небяспечнай для індывідуума» [9, с. 46].

Праекцыя – «працэс, пасродкам якога індывідуум прыпісвае ўласныя непрымальныя думкі, пачуцці і паводзіны іншым людзям і асяроддзю» [9, с. 46]. У апавяданні Цёткі (А. Пашкевіч) «Міхаська» (1914 г.) бачым хлопчыка, непрыгожага ад нараджэння праз хваробу. Міхаська нелюбімы мачахай, яго не прымаюць іншыя дзеці, аднак і сам ён праз комплексы, закладзеныя асяроддзем, ставіцца ў пачатку твора да ўсіх з недаверам і агрэсіяй: «Пачаў Міхась у поле скаціну ганяць. Чураўся ўсіх, хадзіў насупіўшыся, не верыў нікому. Як хто на яго глянуў, зараз Міхасю здавалася, што той аб іх думае: «У-у, які рабы, страшны хлопец» [11]. І хоць хлопчыка многія сапраўды крыўдзілі і абражалі, сама пісьменніца падкрэслівае, што часам яму «здавалася». Гэта было абумоўлена не толькі знешнімі фактарамі, але і нізкай самаацэнкай дзіцяці.

Ва ўжо згаданым апавяданні Цёткі «Міхаська» выяўляецца таксама такі абарончы механізм, як замяшчэнне. У дадзенай псіхалагічнай абароне «выяўленне інстынктыўнага імпульсу пераадрасоўваецца ад больш небяспечнага аб'екта ці асобы да менш небяспечнага» [9, с. 47]. У творы пакрыўджаны на людзей хлопчык пэўны час вымяшчаў злосць на жывёлах: «Жывіна таксама не зазнала ад Міхася ласкі: бізуном рэзаў кожную скуру; Мацееваму бычку рог скруціў, падцёлцы Канцавога Лукаша збіў клуб. Нат сорамна расказваць, – такія ліхаты выкідваў» [11].

Адной з псіхалагічных абарон з'яўляецца выцясненне. Яно ўяўляе «працэс выдалення са свядомасці думак і пачуццяў, якія прычыняюць пакуты» [9, с. 46]. Чалавек забывае траўматычныя падзеі мінулага. У недапісаным рамане Ядвігіна Ш. «Золата» (1920 г.) [12] герой Васіль,

які забіў дзяўчыну Прузыну, пэўны час не думае пра свой учынак. Гэта дазваляе яму, не ведаем наколькі спакойна, але ўсё ж такі жыць (Ядвігін Ш. не апісвае падрабязна ). Аднак праз некалькі гадоў у героя нараджаецца дачка і па царкоўным календары выпадае імя Прузына – такое ж, як у забітай. Тады выцясненне перастае працаваць, у Васіля прачынаецца сумленне, і ён у выніку сканчвае жыццё самагубствам.

Цікавы прыклад у літаратуры, калі пісьменнік ілюструе наступствы неспрацоўвання псіхалагічных абарон (у дадзеным выпадку выцяснення і рацыяналізацыі) – апавяданне «Рускі» (1915 г.) М. Гарэцкага. Галоўны герой-беларус падчас Першай сусветнай вайны забіў украінца, які ваяваў на баку Аўстра-Венгерскай імперыі. Спачатку беларус, сустрэўшыся з украінцам выпадкова, не ў час бою, выпівае разам, перакусвае, аднак пасля, калі ўкраінец сыходзіць, раптоўна ўспамінае ідэалагічную ўстаноўку, што ворагаў трэба забіваць. Пасля, калі герой пабачыў у кішэні мёртвага ўкраінца фотаздымкі сям'і, калі адчуў, што гэта быў такі ж просты чалавек, вымушаны ваяваць, як і беларус, ён пачаў пакутаваць. У беларуса не атрымалася выцясніць з памяці дадзены эпізод. Герой спрабаваў рацыяналізаваць забойства, калі, апынуўшыся ў шпіталі, паўтараў: «Я рускі! Я рускі! Рускі, рускі!..» [3]. Рацыяналізацыя – псіхалагічная абарона, якая «мае адносіны да лжывай аргументацыі, дзякуючы якой ірацыянальныя паводзіны ўяўляюцца такім чынам, што выглядае даволі разумным і таму апраўданым у вачах наваколля» [9, с. 47]. Прызваны ўладамі Расійскай імперыі беларус спрабаваў апраўдаць свой учынак навязаным абавязкам. У выніку герой захварэў, што, напэўна, было звязана і з падсвядомым нежаданнем вяртацца на фронт ды забіваць. Такім чынам выяўляецца і такі механізм, як саматызацыя – уцёкі ў хваробу.

Некаторыя навукоўцы-псіхолагі вылучаюць як асобны абарончы механізм інтраекцыю [10]. Гэты бессвядомы псіхалагічны працэс прадугледжвае уключэнне чужых поглядаў і матываў індывідам. Адным з яскравых прыкладаў дадзенай псіхалагічнай абароны можна назваць нездаровы ўплыў Яроцкага на Шчупака і Лідачку ў аповесці М. Зарэцкага «Голы звер» (1926 г.) [5]. Дзяўчына-студэнтка праз каханне пераймае ўстаноўкі любага, падае маральна, ідзе разам з ім у бардэль. У дарослага і нібыта ўжо сфарміраванага Шчупака пад уздзеяннем Яроцкага змяняюцца паводзіны: ён бавіць час з жанчынай лёгкіх паводзінаў, ідзе на фінансавае злачынства дзеля нажывы. Ідэя твора ў тым, што ў душах многіх людзей ёсць прыхаваныя інстынкты, якія ў пэўныя моманты

могуць выявіцца. І сам Яроцкі адрозніваецца тым, што не хавае сваё сапраўднае аблічча і не прыкрываецца сацыяльнымі нормамі. Але, калі нават на ўзроўні інстынктаў у Лідачкі і Шчупака была пэўная амаральнасць, наўрад ці яна б перарасла ў апісаныя ў творы рэчы, калі б не маніпуляцыі Яроцкага.

Падобным да рацыяналізацыі абарончым механізмам з’яўляецца маралізацыя [7]. Чалавек бессвядома ікмнецца да маральна-этычнага абгрунтавання сваіх ужо здзейсненых учынкаў, паводзін, што ўжо мелі месца, і г. д. Напрыклад, Марына Гарнова з апавядання «Кветка пажоўклая» М. Зарэцкага [4]. Гераіня ў творы падпісала смяротны прысуд уласнаму брату і апраўдвала гэта сваімі перакананнямі: ідэалогія павінна быць важней за сям’ю, сваяцкія сувязі не павінны ўплываць на працу. У гэтым жа апавяданні М. Зарэцкага можна вылучыць псіхалагічную абарону, звязаную з дзейнасцю і паводзінамі, − сыход ад трывогі ў дзейнасць. М. Гарнова пасля смерці брата на пэўны час цалкам прысвяціла сябе працы ў дзіцячым прытулку.

Дысацыяцыя – абарончы механізм псіхікі, які спрацоўвае так, што чалавек пачынае ўспрымаць рэальнасць такім чынам, быццам усё адбываецца з кімсьці іншым, а не з ім [7]. Узнікае дадзеная псіхалагічная абарона як рэакцыя на псіхалагічную траўму. Такі механізм абароны дазваляе глядзець на ўласнае жыццё збоку [7]. Знаходзячыся ў зняволенні, М. Гарэцкі пісаў мастацкі дзённік «Лявоніус Задумекус» (1931–1932 гг.). У творы асоба перыядычна змяняецца, нягледзячы на тое, што сэнсава апавядальнік застаецца адным і тым жа. У дадзеным аўтабіяграфічным творы апавядальнік максімальна набліжаны да пісьменніка, і на ўзнікненне такой псіхалагічнай абароны, выяўленай у змене асобы, на нашу думку, паўплываў складаны стан, у якім на той час знаходзіўся М. Гарэцкі.

Такім чынам, можна зрабіць вынову, што ў беларускай прозе І паловы ХХ стагоддзя псіхалагізм выяўляецца не галаслоўна, а ў адлюстраванні пэўных псіхалагічных з’яў ў межах мастацкага тэксту. Абарончыя механізмы, дзеянне і функцыі якіх звычайна аналізуюцца на жыццёвых прыкладах у даследаваннях па псіхалогіі, адлюстраваны і ў многіх класічных творах.

## Біяграфічныя спасылкі

1. *Андреев А. Н.* Психологизм в литературе: несколько принципиальных штрихов / Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: зб. навук. арт.: у

3 т. / БДУ, Філал. факультэт; рэдкал.: Г. М. Бутырчык (адк. рэд.) [і інш.] Т. 3. Мінск, 2010.
2. *Гарэцкі М.* Выбраныя творы / Максім Гарэцкі; уклад. Р. Гарэцкага і Т. Голуб, прадм. і камент. Т. Голуб. Мінск : Кнігазбор, 2009. 640 с.
3. *Гарэцкі М.* Збор твораў : у 4 т. Т. 3. Мінск, 1985.
4. *Зарэцкі М.* Збор твораў: У 4 т. Мінск : Маст. літ., 1989–1990. Т. 1, Т. 2. 392 с.
5. *Казлова Д.* Псіхалагізм у творчасці Кузьмы Чорнага на прыкладзе аповесці «Лявон Бушмар» // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сборник научных статей по материалам II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–13 апреля 2017 г. Минск, 2017. С. 274–277.
6. *Корань Л.* Цукровы пеўнік: літ.-крыт. арт. Мінск : Маст. літ. 1996. 288 с.
7. *Мак-Вильямс Н.* Психоаналитическая диагностика: Понимание структуры личности в клиническом процессе = Psychoanalytic diagnosis: Understanding personality structure in the clinical process. М. : Класс, 1998. 480 с.
8. *Матрунёнак А. П.* Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана. Мінск, 1975.
9. *Мельник С. Н.* Психология личности: учеб. пособие. Владивосток : ТИДОТ ДВГУ, 2004. 96 с.
10. *Ткачук В.* Праблема псіхалагізму і мастацкага характару ў сучасным літаратуразнаўстве // Беларуская думка. 2014. № 1. С. 98–103.
11. *Цётка.* Выбраныя творы / укладанне, прадмова В. Коўтун. Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. 336 с.
12. *Ядвігін Ш.* Выбраныя творы. Мінск : Маст. літ. 2006. 239 с.

# АВТОРЫ АМЕРИКАНСКОГО ЖУРНАЛА «THE NATION» О ПЕЙЗАЖЕ И ДРУГИХ ТРАДИЦИОННЫХ ЖАНРАХ ИСКУССТВА

***Н. В. Шарангович***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*natallia.sharanhovich@.gmail.com*

В старейшем еженедельном нью-йоркском журнале «The Nation» в разделе «Культура» исследуются традиционные жанры искусства и их трансформация в современном обществе. Сегодня пейзаж, как иные традиционные жанры, вынужден искать для себя принципиально новые формы.

***Ключевые слова:*** пейзаж; жанр; «The Nation».